СЯРГЕЙ СЫС

# ПЕРА-
# ЛЁТ



# ТРАВА

НЯСУМНАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАГА ВЫГНАНЦА

**Галоўны герой** аповесці пад аднайменнай назвай «Пералёт-трава» апісвае жыццё і свае ўласныя перажыванні ў вымушанай эміграцыі. Спачатку – уцёкі з Беларусі ў Расію, потым ва Украіну. Далей – пачатак расійскай агрэсіі і ўцёкі ў Польшу, Нямеччыну і Літву, не маючы пры гэтым аніякіх дакументаў. На ўсім шляху галоўнаму герою сустракаюцца людзі, які бяруць удзел у ягоным лёсе, дапамагаюць і ўрэшце становяцца часткаю ягонага эмігранцкага жыцця. Галоўны герой смяецца, плача, псіхуе, кахае і марыць...

**Аповесць** «За частаколам» – своеасаблівы дзённік звычайнага беларускага псіха, дзе распавядаецца пра псіхічныя станы эмігрантаў і ўцекачоў з Беларусі (псіхічныя разлады, бясконцае пачуццё віны, трывогі, панікі і дэпрэсіі). Цікава, як аўтар параўноўвае ўтрыманне ў беларускіх навінках і ў Літве, распавядае пра псіхіятраў у іншых краінах. Куды аўтар хіліць? Хоча паказаць, як людзі вырашаюць гэтыя праблемы, што і хто ім дапамагае ў такой бядзе. Ну і вядома, пры гэтым спрабуе іранізіраваць сам з сябе.

---

**У кнізе** *таксама змешчаныя апавяданні,*

напісаныя за апошнія гады – «Para bellum» і «Згублены ключ». На завяршэнне – цікавыя карацелькі-жыццёвінкі, некаторыя з іх друкаваліся ў перыёдыцы і сталі легендамі.

---

9 786094 920554

Логвінаў

Сяргей Сыс

# Пералёт-трава

Апавяданні, эсэ, жыццёвіны

Логвінаў

ISBN 978-609-492-055-4

© Сяргей Сыс, 2025
© Lohvinau Publishing House, 2025

# ПЕРАЛЁТ-ТРАВА

Аўтабіяграфічная аповесць

З дзённіка Міколы Салавейчыка:

«Шэсць найдаўжэйшых месяцаў жыцця. Цэлых шэсць месяцаў мне давялося бегчы і спрабаваць выжыць паміж краінамі, паміж гарадамі, паміж мовамі, паміж людзьмі. Памятаю, казалі раней, маўляў, чалавек сам каваль свайго шчасця. Сумнеўна гэта. Я не абіраў падобнай прыгоды, гэта хутчэй яна абрала мяне.
Сёння вельмі хачу апісаць дзіўныя і страшныя падзеі, якія здарыліся ў маім нядаўнім жыцці, бо маю пільную патрэбу паспавядацца хаця б самому сабе, каб адпусціла ўрэшце ўсё тое, што ледзь не сталася для мяне трагічным фіналам».

# «БЫВАЙ, НЯМЫТАЯ РАСЕЯ!»

У ціхай ранішняй вадзе, нібыта ў крывым люстэрку, то складаліся ў пазлы, то крышыліся-вычвараліся адлюстраванні шматлікіх смаленскіх храмаў і доўгая палоска цаглянай сцяны тутэйшага крамля. Яшчэ пакуль прахалодна, але ў Дняпры ўжо стаіць, угнуўшыся, Ігар, ссівелы дзядзька гадоў каля пяцідзесяці, спрабуе адшараваць рачным пяском брудныя шкарпэткі. Час ад часу ён азіраецца вакол: ці не сочыць хто?

Дзякуй Богу — цішыня паўсюль і процьма сонечных прамянёў. Ліпень.

Урэшце Ігар развесіў на лазовым кусце чырвоныя, як ракі ў кіпетню, шкарпэткі, знайшоў на беразе кавалак кардону ад скрынкі з глыбоцкай згушчонкі і прылёг на сырым дняпроўскім беразе.

У ягонай галаве мільгацелі ўражанні ад безлічы перажытага за апошнія дні: сустрэча з маці, бадзянне па знаёмых у Мінску, начныя паездкі ў аўтобусах, якія кіруюцца няведама куды, глухія лясы, лугавіны і чорная дарога ў невядомасць… А потым выбухам — вось ён, Рубікон! — на досвітку з туману літаральна выплыла вялікая надзіманая лодка, якая пераадольвала трывожную памежную раку. Перакінуліся на той бераг. Далей — ізноў таемны аўтобус, які шпарка даімчаў траіх беларусаў да Смаленска. Астатнія, добра-такі падпітыя пасажыры, нелегальна накіраваліся ў бок Піцера.

А што рабіць зараз тут, ну вось што? Ехаць кудысьці далей? Як далей, куды далей?

Ігар разумеў дакладна адно: тут заставацца вельмі небяспечна, у кожны момант могуць праверыць дакументы, якіх няма, таму тэрмінова трэба збягаць са Смаленска, і як мага далей. Толькі вось як набыць квіток без пашпарта?

У дзевяць раніцы шкарпэткі былі амаль сухія. Ён нетаропка пайшоў у бок аўтавакзала, напружана ўзіраючыся ў твары мінакоў. Сапраўды, квітка не набыць, кіроўцы адмаўляюцца везці без яго. А ў шкляной спарудзе аўтобуснага вакзала дзяжураць паліцыянты, вуліцай сноўдаюць узад-уперад «буханкі» «Росгвардыі». Відаць, валіць адсюль трэба.

Паўдня блукаў па цэнтры Смаленска, увесь час думаючы аб тым, што цяпер будзе далей.

Аднак, неяк заціснуўшы свой роспач у кулак, знайшоў лаву ў звычайным двары, выцягнуў з заплечніка і распакаваў новую мабілу, дастаў з патаемнай кішэнькі расейскую сімку, абачліва набытую некалькі дзён таму ў Мінску. Марудна і асцярожна ўзяўся нанава ствараць сваё лічбавае жыццё: паштовую скрыню, акаўнты.

Неўзабаве самсунг пачаў падаваць сігналы: патрэбная падзарадка. Яшчэ адна праблема… У нейкай кавярні дазволілі зарадзіцца, пакуль ён заказаў нешта паесці.

Тут, у занядбанай лавашоўні, гледзячы праз шырокае акно на хмурых і засяроджаных смалянаў, прыгадаў нейкі гарэзлівы вершык пра Смаленск.

Як выпраўляюся ў паход —
заўжды, па-джэнтэльменску,
сваю экспансію на Ўсход
спыняю на Смаленску.

Ля сценаў велічных крамля
палохаю смалянаў:
«Віват, крывіцкая зямля,
Край кніжніка Рамана!»

Даруйце гэтакі імпэт, —
Хацця, чаго дзівіцца!
Не таямніца, не сакрэт:
«Смаленск — мая сталіца».

Тут мой Дняпро і сем халмоў,
Царква на Гарадзянцы…
Вось тут бы жыць, ды час дамоў.
Экспансія — без шанцаў.

Бач, які вершаплёт знайшоўся! Ды хіба ён наш, чужы і небяспечны цяпер горад, дзе ў кожным сустрэчным мроіцца спецслужбовец, гэбіст ці росгвардзеец. Вось зараз падыдзе і запытае: «Здравствуйте! Ваши документы?». Тут ужо і кавідная маска не дапаможа. А потым вядома што: каталажка, дэпартацыя ў Беларусь, ізалятар, суд…

З гэтым горадам у Ігара было звязана некалькі прыгод. Найбольш феерычная з іх — друкаванне

і транспарціроўка ў Беларусь «крамольнай» праваабарончай літаратуры.

Дзясяткі разоў ён ездзіў сюды з флэшкамі і гатовымі макетамі кніг, выбіраў друкарню, заключаў дамовы, аплачваў заказ. Ды тое ўсё для яго, былога гандляра і таваразнаўцы, — драбяза. Самым складаным было цішком перавезці наклады ў Мінск. Рук не хапала, таму ён дамаўляўся са знаёмымі, збіраў вялікія дарожныя валізы, каб перавезці пяцьсот ці болей асобнікаў. Але такі цяжкі груз валізы не вытрымлівалі — адвальваліся колы і адрываліся ручкі. І гэта ўсё пад пільным позіркам смаленскіх паліцэйскіх, якія неаднойчы на вакзале правяралі дакументы і цікавіліся змесцівам непад'ёмных валіз. Кожны раз гэтыя перавозкі ўяўлялі сабой задачкі з некалькімі невядомымі. Але неяк кнігі перавозіліся і распаўсюджваліся ў Беларусі. Цяпер ён можа горда называць сябе кніганошам.

Зараз жа трэба ехаць адсюль далей, ад гэтага трывожнага чужога памежжа. Нарэшце выйсце знайшлося:

«Ёсць жа "Бла-бла-кар"!» Ігар похапкам спампаваў адмысловую праграму ў тэлефон, знайшоў адпаведны варыянт і, добра нахваляваўшыся, ліпеньскай ноччу апынуўся ў Бранску. А што там той дарогі, дзве з паловай сотні кіламетраў!

«Я, папраўдзе, і не думаў тады, што хавацца ў гэтым горадзе давядзецца месяц, напэўна, самы доўгі месяц у маім жыцці. Але нябачны анёл апекаваўся

> мною: знайшліся людзі, і месца пад батарэяй ацяплення на кухні бранскай аднапакаёўкі.
> У кватэры жыло пяцёра беларусаў, пяцёра ўцекачоў з Мордару і пакуль яшчэ збеглых у нікуды. Без рэчаў, без грошай, а некаторыя, як і я, увогуле без дакументаў», — згадваў ён пазней свае першыя ўцякацкія дні ў Расеі.

Яны асцярожна перазнаёміліся, а калі пералічылі агульных знаёмых і сяброў — крыху супакоіліся, пакаліся спаць, маўляў, пазней разбяромся.

Так пачаліся нудныя і трывожныя дні ў выгнанні.

Шмат чаго адбывалася ў той выпадковай камуне. Аднаму з «кватарантаў» на радзіме ў Бабруйску мянты падкінулі ў паштовую скрыню ягоны пашпарт, папярэдне заліўшы яго вадой. То ўсё роўна — які ні ёсць, але дакумент.

Калі пашпарт патаемнымі шляхамі перадалі ў Бранск — хлопец тут жа з'ехаў у кірунку Кіева. Праз некалькі дзён даслаў паведамленне: «Усё ў парадку, жыву ў сяброў, працую ў пахавальным бюро, выношу нябожчыкаў».

Яны ізноў засталіся ўпяцярых: дзіўная сям'я з дочкамі-блізнятамі ды Ігар.

Магчыма, ад перажытых хваляванняў і штодзённага стрэсавага стану праз некалькі дзён Ігара пачала калашмаціць ліхаманка, узнялася тэмпература. На вуліцы спёка, а ён скурчыўся на кухоннай падлозе і клацае ад холаду зубамі, часам правальваючыся ў салодкае забыццё.

Дзіўныя сны сняцца пры хваробе… І не тое каб кашмарныя — абнадзейныя. Але потым… А потым ляжыш, адурманены начнымі відзежамі, і смакуеш іх, перажываеш нанава і крыху шкадуеш, што гэта ўсяго толькі сон. Толькі ў іх можна вярнуцца ў далёкае і незваротнае, толькі ў іх магчыма дакрануцца да будучыні.

Колькі ні тлумачылі прыроду сноў спецыялісты — усё адно для людзей гэта загадка, салодкая такая, хітрая загадка…

Некалькі разоў бачыўся адзін і той жа сон Ігару — такое ўражанне, што ён проста пракручваўся недзе ў звілінах ягонага перагружанага думкамі мозгу...

Пакручастая, у смарагдавым аздабленні, дзесьці ўнізе цьмяніцца Дзясна. Ён бяжыць на бераг, ускаквае ў прышвартаваны белы катар, які з гулам кранаецца і хутка імчыць па звілістай рацэ. Рукі напружана трымаюць штурвал. А ззаду нібыта блізкая пагоня. Ігар ліхаманкава азіраецца: разганяючы хвалі, за ім імчаць «буханкі-ўазікі» з надпісамі «Росгвардыя». Ён дадае хуткасці, і вось ужо карабель адрываецца ад паверхні вады і ўзлятае ў неба… Пад ім, як на гугл-мапе, — дрэвы, палеткі, лясы. Недзе ўжо блізка Украіна, збавенне. І тут сціхае рык матора, і катар імкліва зрынаецца ўніз. Ігар адчувае, што ляціць кудысьці ўніз, задыхаецца і, прачнуўшыся, цяжка аддыхваецца.

Яно ж як? Калі цябе пазбавілі дому і дахаты трапіць немагчыма, тады ты, як пакінуты без дагляду човен без вясла, плывеш і плывеш ракою ўдалеч. І ты

не можаш прыбіцца хоць да якой прыстані, каб адпачыць і адчуць пад нагамі трывалы бераг. Табе няма дзе прычаліць, няма дзе спыніцца. Застаецца адно плысці, плысці й плысці, туды, дзе хвалі прыб'юць твой човен да сушы.

Таму, можа й снілася адно і тое ж.

Калі надаралася зацішша ў сутарэннях бранскага падполля — Ігар занатоўваў свае думкі, добрыя і не вельмі, у тонкі, складзены ў дзве столкі, сшытак. Часам сыходзіў у роздумы. Вось, аднаго разу задумаўся аб тым, што расейцы нейкія не такія цяпер, як раней, ці, можа, ён і не ведаў іх увогуле? Відаць, не.

«Назіраючы за тамтэйшым жыццём, раз-пораз пачынаў разважаць аб тым, што сталася з гэтым народам у апошнія гады. Ці гэта вынікі ідэалагічнай апрацоўкі і татальнай прапаганды? Відаць, трохі такога ёсць. Але прыгадвалася і ранейшае, трывожнае — маё першае судакрананне з праявамі рэальнага расейскага шавінізму.
Было тое даўнавата, калі, як кажуць, "вароны яшчэ ў вырай лёталі". Мяне запрасілі паўдзельнічаць у якасці госця ад Беларусі ў міжнародным фестывалі "Поющие письмена" ў Цвяры ў далёкім 2012 годзе. Паехаў. А што? Штогод туды запрашаюць беларусаў, і не абы-якіх. Някляеў там быў, Галіна Дубянецкая, яшчэ нехта, выпала прозвішча з галавы…
Сабралася тады на фэсце паэзіі славян з усяго свету некалькі дзясяткаў — паэты і перакладчыкі

з Балгарыі, Беларусі, Македоніі, Польшчы, Сербіі, Славеніі, Славакіі, Украіны, Харватыі, Чарнагорыі, Расеі. Выступы, сустрэчы, міжсабойчыкі… Вечарам запрасілі да сябе на карпаратыўчык прадстаўнікі маскоўскай эліты: навукоўцы, публіцысты, паэты, мэтры культуры. За кілішкамі пайшла размова пра ролю Расеі ў сусветным парадку. Уставіў свае пяць капеек і я, наіўна мяркуючы, што такія дасведчаныя людзі больш за мяне абазнаныя ў гісторыі ды маюць што распавесці і пра ВКЛ, і пра Кіеўскую Русь, і пра Масковію.

Цяжка перадаць словамі, што мне давялося пачуць ад сівых маскоўскіх аўтарытэтаў.

— Ігар, ты яшчэ малады і не разбіраешся ні ў чым. Вы ж, беларусы, нашы малодшыя братушкі, але навошта вы спрабуеце плясаць пад дудку Еўропы, навошта выйшлі на Плошчу? (2010 год).

Нехта пачаў казаць пра боскае пакліканне Расеі як збаўцы ўсяго свету ад фашысцкай чумы, пра раўнавагу, на якой трымаецца мірапарадак, маючы на ўвазе ЗША.

Даводзілі мне, што толькі пад крылом “матухны Расеі” беларусы могуць “людзьмі звацца”.

Крыўдна мне стала. Выхапіў з кампаніі дзвюх маладых польскіх паэтак-блізнятак, якія слухалі “старэйшых братоў”, разявіўшы раты. Пайшлі разам блукаць па горадзе ў пошуках прыстойнага прытулку пад вольным небам.

І толькі вось тое “выкраданне паэтак” назаўтра мне і не даравалі».

З дзённіка Міколы Салавейчыка:

«Страшэнная шызафрэнічная мясарубка ў Беларусі... А днішча пакуль яшчэ і блізка не відно. Праз месяц-які там жа напэўна звар'яцеюць усе... Каб яны самі сябе зжэрлі... Адчуваю, што калі цэрберы, як вусені, даядуць усіх нас — зоймуцца канібалізмам, пачнуць жэрці сябе. Ладна, праехалі...
У мяне свая турма, у вас — свая. Кожны ў сваёй турме. Трэба шукаць пазітыў у тым, што застаецца. Вось напёк сёння картопляў з лупінамі нараніцу, ды з соллю, з соллю!»

І як жа Ігару не пагадзіцца з Міколавымі запісамі. Сапраўды, многія зараз у нейкай ступені знаходзяцца ў турме, а яна можа быць не толькі фізічнай, з кратамі, мурамі, высокімі сценамі, вертухаямі. Турма ёсць такі стан, калі ты не маеш магчымасцяў на многія рэчы, не можаш быць дома, не бачыш жонкі і дзяцей, ды яшчэ розныя абмежаванні адчуваеш, знаходзячыся ў выгнанні, элементарна ты ні на хвіліну не здатны быць у спакоі. Некаторыя з тых, хто пакінуў краіну і жыве ў выгнанні, кажуць: «Трэба жыць тут і цяпер, жыць напоўніцу, узахлёб».

«Прабачце, — вінаваціўся ён ці то сабе, ці казаў іншым, — я так не магу. Колькі ні перасільваў сябе, але ў мяне застаецца пачуццё віны, што я на волі, а многія ў турме. Таму і абмяжоўваю сябе шмат у чым».

Каб канчаткова не звар'яцець у вэрхале аднапакаёўкі на маленечкай кухні, Ігар часта цішком выбіраўся ў горад. Звычайна гадзіне а сёмай раніцы, калі на вуліцы дахалеры хмурнага шэрага люду, які, не дарэшты прачнуўшыся, спяшаецца на працу, ён крочыў бліжэй да ўскрайкаў Бранску. Выбіраў ціхія вулічкі, дзе яшчэ захаваліся старыя каржакаватыя хаты, неаднойчы перабудаваныя, альбо зусім занядбаныя. Міжволі разглядаў пабудовы, прысады, кветнікі. Але найбольш яго цікавілі ліштвы на вокнах. Яны і падобныя да традыцыйных паляшуцкіх, і крыху інакшыя. Заўжды вяртаўся з вылазкі з яблыкамі ды слівамі, якія пачалі ўжо адрывацца ад галін і падаць у траву ці на ходнікі.

А яшчэ моцна карцела, аж да свербу скуры, вярнуцца назад. Хоць як: прапаўзці незаўважаным, пераляцець, зрабіць падкоп, у рэшце рэшт. Хоць на нейкі час вярнуцца, паразмаўляць яшчэ разочак з маці, падтрымаць яе, убачыць свой дом і дняпроўскія ірвішчы. Ігару ў марах здавалася, што ўсё гэта можна неяк зрабіць, ды так зрабіць, каб потым можна было зноў збегчы адтуль.

Напачатку жніўня, ідучы галоўным праспектам, Ігар раптам убачыў шмат чырвона-зялёных сцягоў і вайсковых аўтамабіляў на беларускіх нумарах. Аслупянеў на хвіліну: што гэта за экспансія такая. Але, услухаўшыся ў пафасныя словы, якія разляталіся па горадзе праз дынамікі, зразумеў, што праходзіць нейкая супольная акцыя «братэрскіх» народаў пад назваю «Дзень паветрана-дэсантных войскаў».

Тым часам безграшоўе ў Бранску сталася звыклай з'явай, бо той запас, які Ігар напазычаў у знаёмых «на дарожку», скончыўся недзе праз тыдзень «райскага» жыцця. А ўсё таму, што камусьці з кампаніі было яшчэ горш. Часам атрымлівалася дастаць трохі грошай і тут, але да іх ставіліся вельмі ашчадна. Таму рацыён гаротных беларусікаў быў часам занадта сціплы: бульба, макароны, яйкі, зрэдку сасіскі, цыбуля, алей. Ратавала толькі адно: сярод нашай пяцёркі знайшлася кулінарная багіня, якая з гэтага «нічога» магла зрабіць «нешта».

Калі надыходзіў поўны кірдык, Ігар прыбягаў да апошняй магчымасці — пісаў колькі слоў таемнаму чараўніку «Фёдару». Імя гэтае вядомае сотням беларусаў, якія наважыліся на «рывок», пра яго нават артыкулы пісалі. Вось толькі наўрад ці хто бачыў гэтага чалавека жыўцом. Ігар ведаў, што існуе нейкая «служба эвакуацыі», нейкі Фёдар, які і ўдзень, і ўночы прыйдзе на дапамогу. Дапамагаў ён неаднойчы выжыць і бранскай кампаніі ўцекачоў.

Савецкая ідэалогія ўбіла ў галаву Ігара выснову, што Бранск — гэта сталіца вайсковай славы, партызанскі край, а з памяці раз-пораз вылузваўся радок песні «Шумеў сурова бранскі лес», ну і ўсё такое пафаснае. Але рэчаіснасць змяніла ягонае ўяўленне пра гэтае месца.

Неяк ля гандлёвага цэнтра на Чырвонаармейскай выпівоха цішком прадаваў ракаў. Дзеля цікаўнасці Ігар запытаўся пра кошт, а потым, хітра так, пра тое, дзе яны водзяцца. Пачаставаў п'янюгу цыгарэтай

і выдабыў у яго інфармацыю пра запаветныя мясціны. Тым жа вечарам разам з яшчэ адным выгнанцам яны варочалі ў возеры камяні і карчы, абшарвалі розныя ямінкі і норкі. У выніку здабылі сем вялікіх ракаў. Канечне, можна было і ў Дзясну ўлезці, але рачныя берагі аблюбавалі кампаніі бранчукоў… Наедку з тых ракаў на вялікую сябрыну было з гулькін нос. Аднак, блукаючы вуліцамі горада, можна было зрабіць выснову, што Бранск прэтэндуе на ролю ракавай сталіцы Расеі. Раз-пораз натыкаешся на чорна-чырвоныя шыльды крамак «Ракі & Крабы», у якіх на заказ гатуюць любыя порцыі гэтых смачных насельнікаў рэчак ды азёр. Трапляюцца і ракаварні «Клюшні і хвасты», альбо «Дзве клюшні». Нават гарадскі пляж Ігар пра сябе называў «берагам чырвонага хіціну» — так шмат валялася тут ракавага шкарлупіння. Ён дзівіўся часам: «Адкуль у такой колькасці тут ракі, можа іх разводзяць адмыслова?».

Найбольшыя клопаты прыносіла курэнне, паколькі ўсе дарослыя цмыгалілі вельмі часта. Але хутка разабраліся, што ў кожным кіёску «Роспечати» — амаль поўны набор усялякіх беларускіх цыгарэт. Проста іх не кладуць на вітрыну, бо ўсё гэта кантрабанднае. Але варта толькі запытаць у прадаўчкі — і яна знойдзе амаль любую айчынную марку. Прычым, нашмат танней ад расейскага тытуню. Муляла і раздражняла толькі адна думка: набываючы беларускі кантрабандны тытунь, нейкім чынам ты сам спансуеш вусатага. Бо то з ягонага «бласлаўлення» і пад ягоным кантролем кантрабанда беларускіх

цыгарэт у суседнія краіны набыла проста фантастычныя маштабы.

А яшчэ памятаю, як моцна карцела прыпасці сасмяглымі вуснамі да кухля халоднага піва, аднак на тое грошыкаў дакладна ўжо не ставала.

З дзённіка Міколы Салавейчыка

«Вельмі ўдалы дзень. Пераканаўся, што выслоўе “Хто рана ўстае, таму бог дае…” мае не ябы-які сэнс. Выйшаў а палове на сёмую з хаты і пайшоў пешкі ў цэнтр Бранску, на прагулянку. І вось першая ўдача: звярнуў увагу на пачак цыгарэт “Парламент”, які неяк няправільна ляжаў на ходніку, прыціснуў пачак спачатку нагой — не пусты, — падняў, і вось табе маеш: амаль усе цыгарэціны на месцы. Тут жа ўгледзеў столік пры летняй кавярні, сеў і смачна зацягнуўся. “Жыццё наладжваецца”, — падумаў сабе.
А пад нагамі тым часам нешта бліснула: так і ёсць, манеты. Сабраў хуценька, палічыў — 32 рублі. Шпарка пакрочыў да бліжэйшай крамы і набыў сабе парачку “ролтанаў”».

Калі ў Бранску ўстыла і абрыдла ўсё, а прадавачкі ў бліжэйшых крамах пачалі з ім вітацца: «Прывет, беларусік!», зважаючы на ягоны невынішчальны акцэнт, Ігар прыняў рашэнне кіравацца адсюль як мага далей. Таемны «Фёдар» падказаў далейшы кірунак — Арол.

Горад гэты застаўся ў памяці найперш сваімі крыху незвычайнымі манастырамі, стракатымі храмамі ды яшчэ рэчкамі — Акой, Орлікам, Журавінкай і на ўскрайку Сухой Арліцай. А яшчэ тут нашмат лягчэй, чым у Бранску, можна было «схавацца» ў гарадскіх кварталах ды скверах.

Ігару таксама было цікава разведаць, чаму менавіта Арлу надалі званне «Літаратурнай сталіцы Расеі». Відаць, падвысілі статус, каб турыстаў сюды болей завабіць. А з іншага боку, у горадзе сапраўды шмат знакамітых літаратурных месцаў: у Арле нарадзіліся Іван Тургенеў і Леанід Андрэеў, пэўны час жылі Сяргей Ляскоў, Іван Бунін ды іншыя вядомыя пісьменнікі. А ўся Арлоўшчына — радзіма Фета, Пісарава, Цютчава, Прышвіна, Новікава. Мясціны гэтыя звязаныя таксама з жыццём Пушкіна, Ясеніна і Талстога, які Леў. Нават яму, нелегалу, было цікава ведаць пра тое. Наведаў-такі некалькі помнікаў і літаратурных музеяў.

Болей за ўсё Ігар тады шкадаваў, што анідзе на пакручастым шляху беларуса-ўцекача не знаходзілася хоць якой кнігі, няхай бы чытанай раней, няхай бы якое літаратурнае смецце. Ну хоць ты трэсні — усе гэтыя стромныя флэты, што траплялісе на ягоным шляху, былі начыста пазбаўленыя хоць якой літаратуры. Адзінае чытво, якое ён меў, — пашкуматаныя нататкі нейкага незнаёмага беларуса, Міколы Салавейчыка, які, відаць, раней за яго прайшоў свой няпросты шлях да волі. Гартаючы тыя бязладныя запісы, Ігар параўноўваў свае пачуцці з Салавейчыкавымі

і знаходзіў шмат агульнага: выпадала так, што нічога ўнікальнага ў ягоным лёсе не адбылося, усе гэтыя прыгоды былі перажытыя раней іншымі. Гэта яго крыху супакойвала і не давала канчаткова зрынуцца ў бездань роспачы і адчаю.

Што яшчэ здзіўляла яго ў Арле — гэта безліч мемарыяльных шыльдаў: і першаму сакратару абкама, які тут правіў тады і тады, і нейкаму намесніку міністра, які жыў вось у гэтай абшарпанай хрушчоўцы, кавалеру нейкіх ордэнаў, які праліваў сваю кроў за «светлую будучыню», і знакамітаму інжынеру, што вынайшаў нейкую хітрую сістэму мацавання рознакаліберных бетонных канструкцый.

Першыя дні ў Арле прабеглі-праплылі хутка, нібыта краявіды за акном шпаркага цягніка. Але хваля безвыходнасці напаткала ўцекача і тут. Ну так, пэўна, ён шмат разважаў перад тым, як пакінуць радзіму, і шлях сюды быў вельмі складаны. Пры затрыманні ў Ігара забралі ўсё: тэхніку, дакументы, карткі, пашпарт. Ён яшчэ паспеў выдаліць усе свае акаўнты і электронную скрыню. Цяпер, падаецца, у бяспечным месцы і можна даць сабе палёгку. Аднак уся гэтая псіхалагічная канструкцыя развалілася неўзабаве: дні пабраліся нервовымі пухлінамі, якія час ад часу выбухалі раздражненнем і трывогай. Няраз хацелася проста набрацца смярдзючай расейскай гарэлкі.

Ясна, што і тут ён быў не адзіны збеглы беларус. Нават у кватэры, дзе даводзілася туліцца, жыло іх некалькі. Многія з уцекачоў дэпрэсавалі і з недаверам

ставіліся адзін да аднаго. Яму згадаўся расповед аднаго з нашых, які таксама, не маючы пашпарту, цішком перасоўваўся па абшарах «нямытае Расеі». Неяк яму давялося каля тысячы кіламетраў па гарачыні праехаць у фуры, наладаванай скрынкамі з апельсінамі. Ведаеце, пэўна, што цытрусавыя выпрацоўваюць розныя эфірныя рэчывы. У малой колькасці яны нават карысныя, але ў зачыненай, апламбаванай фуры, дзе апельсінаў дзясятак тон, гэта ледзь не прывяло яго да страты прытомнасці і поўнае нірваны. Колькі ўсяго страшнага давялося пачуць за гэты час!

Ігар і дагэтуль не можа забыцца на жахлівую гісторыю менскага сіраты Алеся, які добраахвотна ўзяў на сябе ролю кухара ў чарговым падпольным жытле. Ён распавядаў астатнім пра лёс свайго сябрука.

Гэта было ў Менску напрыканцы траўня. Дзіму Стахоўскага, ягонага найлепшага сябра, следакі абвінавацілі ва ўдзеле ў шэсцях у жніўні 2020 года і стварэнні барыкад каля «Рыгі». Васямнаццацігадовы юнак не вытрымаў і скокнуў з шаснаццаціпавярховага будынка. Хлопец перад гэтым пакінуў пост «ВКонтакте», у якім растлумачыў свой крок жорсткім пераследам сілавікоў:

> «Віной таму стаў Следчы камітэт. Калі б на мяне не працягвалі маральна ціснуць, думаю, я б не вырашыўся на такі жудасны ўчынак як суіцыд. Але мае сілы былі на зыходзе», — напісаў ён.

Зняволенне чакала і Алеся, і, пэўна, усё скончылася б турмой, аднак ён вырашыў збегчы з краіны. Ігару давялося яшчэ двойчы сустракацца з ім пазней, ужо ў Кіеве. І цяпер, праз колькі гадоў, ён таксама стараўся сачыць за лёсам «Сашы Тунгуса», так называюць яго ў палку Каліноўскага.

А тут Ігарава жонка паведаміла, што на менскую кватэру прыходзілі нейкія «супрацоўнікі», распытвалі пра яго: «Можа, вам вядома, дзе падзеўся муж? Мусіць, маеце ягоныя кантакты?». Мудрая Каця разводзіла рукамі — знік. Апытвалі таксама і суседзяў, ці з'яўляецца тут гаспадар. Але тыя — крэпкія мацакі, прайшлі і калоніі, і ЛПП, развялі рукамі і памаўчалі.

З дзённіка Міколы Салавейчыка:

«Незразумелы сон сасніў сёння: нібыта мне дазволілі спатканне з бацькам. Мяне вядуць да яго ў камеру… Там акрамя бацькі — нікога… толькі мы ўдвух. Паселі на нары, я дастаў нейкіх пакункаў з ежай, соку. А ён кажа: "Навошта гэта тут? Зараз гарбаткі запарым". Сядзім сабе, нешта ўспамінаем, смяёмся…
Ранкам думаю: "Да чаго б гэта? Ці ён на волю, ці я да яго?".»

Самы выбуховы ўспамін з перыяду «арлоўскіх» хованак застаўся ў Ігара пра нечаканую сустрэчу з мясцовым бабром. Гэтую гісторыю ён занатаваў

вельмі падрабязна, настолькі моцна яна ўшчамілася ў ягоную перапоўненую памяць:

> «Аднаго разу выйшаў на ўскраек горада паблукаць па мясцовых карчах-пералесках. Дрогкая цішыня вакол, сцяжына віецца лагчынкамі ды пагоркамі, круціцца вужакаю сярод асін, вольхаў, елак. Раптам заўважаю, проста перад сабой, пасярод сцежкі, нейкую дзіўную постаць. Не чалавек, не воўк, не сабака… Бабёр! Курва!
> Стаіць сабе моўчкі, углядаецца ў мяне і не саступае дарогі. Прыгледзеўся — дык ён жа плача. Слёзы гарохам сыплюцца па бліскучым футры звера. Такога дзіва мне не даводзілася бачыць нават у маім улюбёным дняпроўскім краі, дзе баброў — нялічана! Пазней, ужо ва Украіне, я вырашыў дазнацца пра такія паводзіны звярка. Уведаў, што бабры сапраўды плачуць, калі нехта — стыхія альбо людзі — руйнуюць іх жытло. Моцна мяне зачапіла тое здарэнне, і ўспамін пра нечаканую сустрэчу аж дагэтуль захрас у перапоўненай відзежамі галаве».

«Асцярожна, дзверы зачыняюцца! Наступная станцыя — Курск». У гэтым горадзе баявой славы Ігару выпала спыніцца на тыдзень, таму глыбокіх уражанняў ён не пакінуў. Манастыроў і храмаў тут дзясяткі, нават касцёл аднойчы трапіўся на вока. Нездарма Курск яшчэ велічаюць рэлігійным цэнтрам Расеі. І рэчак тут розных, невялікіх і брудных, як

гразі: Кур, Моква, Тускар, Крывец. Ну, і калі ад’ехаць далей ад цэнтру — то Сейм. Адзіная рэчка, упадабаная Ігарам падчас блуканняў па расейскіх абшарах, нават верш пра яе неяк склаўся:

Сяджу ў Сейме,
увесь непрыступны і важны,
цешуся плынню ракі,
жыццём, якое плюхае блізка.
А спёка апоўдні невыносная проста, ажно —
кацёл мой гарыць
і ў вачах каляровыя пырскі.
Сяджу-засядаю,
замкі з пяску праектую,
аднагалосна ў Сейме
прымаю дэкрэты...
Ды раптам хваля ліхая
замкі мае руйнуе.
Ізноў неакрэслена ўсё…
І, можа, не варта болей аб гэтым...

У Курску Ігар адчуў, што патроху пачаў абмаскальвацца: смялей пачаў перасоўвацца па горадзе, намагаўся пры кароткіх размовах з абарыгенамі не гэкаць, рабіўся больш вульгарным і цынічным. Тут гэта выглядала неяк натуральна, як і канфлікты на пустым месцы разам з частымі вулічнымі бойкамі невядома з якой нагоды. А яшчэ запомнілася яму суцэльная брыдкая лаянка на фоне шматлікіх залатых цыбулінак храмаў. Жыццё амаль

паводле Дастаеўскага: «Усё, што рускія ўзялі ад праваслаўя, — перахрысціцца перад тым, як засячы цябе сякерай».

Ледзь адыдзешся ад цэнтра, як паўсюль разруха, смецце і бухія куране спрэс валяюцца на лавах і побач з імі. Іх нават «Росгвардыя» не падбірае.

Няхай чытачы выбачаюць, але ў галаве беларуса некалькі разоў пракручваліся крылатыя радкі Ёсі Бродскага: «Лепшы від на гэты горад — калі сесці ў бамбавік».

Можа, тут Ігар згусціў фарбы, і агіда ягоная перабольшаная, бо ў гэтым горадзе яму давялося хавацца ў прамысловай зоне, у нейкіх падпольных начлегах, дзе інтэлігенцыі не адшукаеш і днём з агнём. Дзе тут яму было шпацыраваць праспектамі, абнасіўшыся амаль да рыззя, у падраных кедах! Смялей было лазіць прыгараднымі сцежкамі, засмечанымі аж да немагчымасці пластыкоўкамі, недапалкамі і прэзерватывамі. Брудна, але бяспечна.

Неаднойчы ў такіх падарожжах згадваў сваё затрыманне і апошнюю сустрэчу з даўнім сябрам Алесем, перагортваў і перадумваў падзеі фатальных ліпеньскіх дзён:

> «Другая ноч у спякотнай і вільготнай камеры на Акрэсціна была трывожнай, без сну і спакою, з правакацыямі “падсадных суседзяў”, якія ад паўночы і амаль да ранку сінхронна тупацелі ўзад-уперад па камеры, патрабавалі цыгарэты ў ахоўнікаў, і тыя — а цуд! — ім выдавалі па некалькі штук.

Разоў колькі перапытвалі мяне, ці за “палітыку” мяне загрэблі. А то, маўляў, праз бэчэбэшнікаў ім самім тут стала некамфортна, нават матрацы пазабіралі. Так і ёсць, правакатараў падсадзілі.
Ранкам усіх іх вывелі, як і многіх іншых з суседніх камер, пашыхтавалі і адправілі на допыты: каго ў СК, каго ў КДБ, каго ў Раусы, і амаль да 15-й гадзіны я заставаўся ў камеры сам-насам са сваімі цяжкімі думкамі.
Нечакана пасля абеду, хаця пра які абед гаворка, калі ніводнага разу мяне нічым не кармілі, загадалі збірацца на допыт. Вывелі аднаго ў калідор бліжэй да выхаду і паставілі тварам да сцяны. І вось у гэты момант адбылася самая кранальная і важная для мяне ў тыя дні сустрэча. У калідор завялі Бяляцкага і таксама паставілі да сцяны.
Алесь павярнуўся да мяне, вельмі цёпла пасміхнуўся, паказаўшы пальцамі “вікторыю”.
— Не размаўляць! — пачуўся грубы загад.
А мы і не размаўлялі. Мы добра паразумеліся позіркамі. Паспелі навучыцца за чатыры дзясяткі гадоў сяброўства.
Апошняя ліпеньская сустрэча з Алесем надала мне трываласці, а таксама разумення, што я не адзін, што мы вытрываем».

Ніякага прасвету ў Беларусі не назіралася, лік затрыманых пераваліў за тысячы, кожны дзень у стужках навін, якія ліхаманкава пракручваў у тэлефоне Ігар, мільгацелі прозвішчы сяброў і проста знаёмых.

Усё меней і меней шчымела сэрца ад бясконцых рэпрэсій і сур’ёзна непакоіў уласны лёс: ці скончыцца калі жахлівае бадзянне, і яго вынесе шчаслівай хваляй на спакойны і трывалы бераг.

Але лёс быў літасцівы да выгнанца — нядоўга ён кантаваўся ў гэтых мясцінах.

«Наўрад ці я траплю сюды яшчэ калі-небудзь, у горад расейскай баявой славы», — разважаў, пакідаючы Курск у багажніку легкавіка, Ігар.

Ягоны трывожлівы шлях віўся далей, у іншыя месцы і краіны, праз калючыя памежныя платы, пражэктары і патрулі — да волі, да неверагодных сустрэч з новымі сябрамі, стасункі з якімі працягваюцца і дагэтуль.

Няхай застаюцца пакуль таямніцай падзеі, што знітавалі два ягоныя станы: фатальную непазбежнасць існавання ў Расеі і шчасны выдых палёгкі пры неспадзяванай ужо сустрэчы з Украінай.

Вось яна вакол, ранішняя, крыху золкая, светлая, квяцістая, шчодрая, вольная…

Толькі, як кажуць часам людзі, «ягадкі яшчэ не паспелі».

## СОНЦА, КАРПАТЫ І ШЫНА

Паслухай, Шына, няўжо табе сапраўды цікава ведаць нешта пра мяне, ведаць пра тое, што я перажыў за апошні час, якія выпрабаванні наканаваў мне лёс?

Ты ж такая маладая, і жыццё канадскае зусім не падобнае да жыцця зламанага-пераляканага старога беларуса. Навошта табе гэта ўсё?

Настойваеш на сваім? Цікава, кажаш. Але ж мова, як даць рады з ёй? Я практычна не размаўляю па-ангельску, ведаю, можа, сотню якую слоў, ты не ведаеш беларускай, хіба што паспела ў сваім падарожжы намацаць колькі там украінскіх ды расейскіх слоўцаў. Ну, але… давай паспрабуем, збяром усе нашы моўныя набыткі ў адну жменю, дадамо туды гугл-перакладчык, ды, можа, неяк і пасумовімся.

Пытаешся, якім чынам я, беларус, апынуўся ва Украіне? Ты, напэўна, ведаеш пра падзеі 2020 года, пра пабоішчы, смерці і разгоны дэманстрантаў, якія рашуча выказвалі сваю нязгоду з «выбарам» уладара Сінявокай? Трапіў пад пераслед і я. Але, скарыстаўшыся падпіскай аб нявыездзе, цёмнай ліпеньскай ноччу збег у Расею, дзе таксама было небяспечна і трывожна, а ўжо адтуль, рызыкуючы многім, дабраўся да Украіны. Пра тое, Шына, я табе яшчэ некалі распавяду, а зараз чытай у тэлефоне мой расповед пра жыццё ва Украіне. Бог помач, транслэйт!

Пасля бадзянняў па расейскіх абшарах мне пашанцавала ноччу перайсці ўкраінскую мяжу. Зразумела, што з дапамогай многіх людзей. Нават спалохацца не паспеў, хаця хваляванняў было аж занадта. Распавядаць пра тое нават табе не хачу, шмат хто з'яўляўся ўдзельнікам звышсакрэтнай аперацыі, і няхай ім усім будзе добра.

Ачомаўся ўжо на аўтавакзале ў Сумах, затым паўдня ў перапоўненай маршрутцы дабіраўся да Кіева, з падоранай добрым чалавекам сімкай «Кіеўстар». Ужо ў дарозе пра мой далейшы лёс пачалі клапаціцца невядомыя анёлы: таемны «Фёдар» дасылаў інструкцыі на першы час, нехта прапанаваў часовае жытло ў Кіеве і нейкую матэрыяльную дапамогу. А грошай і сапраўды не засталося ані ру… бля, ані грыўні.

Кіеў сустрэў прыкрай неспадзяванкай. Спяшаўся ўскочыць у перапоўнены вагон метро на «Вакзальнай» і паспеў быў, але заплечнік застаўся вонкі, за дзвярыма. Праз некалькі секундаў на плячах засталіся толькі шворкі, а шчыльна напакаваны заплечнік знік у віхурах чорнага тунэлю. А разам з ім і маё апошняе майно — шмоткі ды брытва. Таксама незваротна зніклі мае бязладныя запісы і дзённік Міколы Салавейчыка, які трапіўся на вочы ў адной з падпольных кватэр, у якіх даводзілася кантавацца ў Расеі.

Сведкай той катастрофы была даўняя баявая сяброўка, якая таксама вырашылася з'ехаць *адтуль* і змагла адшукаць мяне ў Бранску, і з якою разам, начнымі блытанымі сцежкамі, трапілі ў Кіеў, а потым і ў Чарнігаў.

Гэта яна прымусіла мяне наранiцу звярнуцца ў паліцэйскі ўчастак на станцыі метро. Маўляў, ноччу цягнікі не ходзяць, і пуцейцы правяраюць тунэлі. Зразумела, паліцыянт зарагатаў:

— Жартуеце? У тунэлі ад цягнікоў узнікаюць такія віхуры паветра, што заплечнік ваш там адразу

ператварыўся ў пыл. Самім трэба быць больш акуратнымі. До побачэння!

А літаральна праз некалькі дзён і зусім нечакана для мяне адгукнуліся мае сябры-калегі з Луцку. Даведаўшыся, што я цяпер у вольным і бяспечным Кіеве, мяне запрасілі на Міжнародны літаратурна-мастацкі фестываль «Лісова пісня», прысвечаны творчасці Лесі Украінкі. Пагадзіўся без ваганняў, нават нягледзячы на эпідэмію кавіду. Мяне нават нейкім чынам засялілі без пашпарта ў гатэль «Україна». Эх, незабыўныя тыя дні.

У Луцку сустрэў мяне і ўсе фестывальныя дні апекаваўся маім лёсам навуковец і паэт Мікола М. А самае цікавае, Шына, што перад гэтым, ці не за год, я ўжо быў госцем гэтага паэтычнага фэсту. Таму штодня надараліся радасныя сустрэчы з вядомымі мне літаратарамі, паэтамі, мастакамі і проста знаёмцамі, ды і сам горад быў не чужы.

Гаючым адхланнем стаўся гэты фестываль для мяне: былі выступы ў мясцовым універсітэце і перад творчай моладдзю, піўны рок-фэст з бочкамі разнастайнага піва заводу «Zeman», паездкі па мясцінах, звязаных з жыццём Лесі Украінкі, музеі, замак Любарта, зялёныя вочкі паэткі Элі, «сумская царівна» Вольга, весялун Сашко і ягоная аматарская кінастудыя «Валынь». Той кінематаграфічны падвал у цэнтры горада — самае ўлюбёнае месца ў Луцку, куды можна было знянацку «даць нырца» і ціха перасядзець шумныя імпрэзы за кілішкам якогась напою з закускай.

На свята дасталіся нават літаратары з Беларусі і сёе-тое перадалі ад маёй далёкай цяпер жонкі. У Луцку я на некалькі дзён забыўся пра ўсе свае трывогі, пра неакрэсленую і туманную будучыню. Крыху захваляваўся толькі аднойчы, калі трэба было ехаць на паэтычныя выступы ў Ковель і Шацк, мясціны на самай мяжы з Беларуссю, смешна, але спалохаўся, што могуць там, каля мяжы, схапіць беларускія сілавікі, альбо, зважаючы на адсутнасць пашпарту, украінскія памежнікі. Але абышлося.

Але ты, Шына, зусім няпростая, прызнайся, відаць, таксама пішаш? Чакай, сам скажу — хутчэй за ўсё, вершы. Здагадаўся? Ну вось, цяпер між намі цяплей, цяпер пачынаю разумець, чаму ты адважылася на авантуру і збочыла са свайго планаванага маршруту ў бок майго цяпер Чарнігава.

Мне спадабаўся тады твой шчыры адказ: «Толькі паэты могуць па-сапраўднаму зразумець адно аднаго. Я думаю, што верыць словам — гэта такі асаблівы акт адвагі».

Не спіш яшчэ? То давай працягнем далей. Усё адно ўжо гэтай ноччу спаць не выпадае.

Толькі вярнуўся з фестывалю назад у Кіеў — і на мяне абрынуліся розныя клопаты і праблемы: жытло, дакументы, статус, грошы. Я ж нават пашпарта не меў. Трэба было неадкладна дбаць пра сваё пакуль што цьмянае будучае. Заглыбіўся напачатку ў вывучэнне працэсу легалізацыі, але Кіеў, велічны і залаты, неадольна чараваў сваімі прынадамі ды сустрэчамі з ранейшымі сябрамі і сяброўкамі: «Вунь

славуты Васіль Парфянкоў спрачаецца пра нешта з хлопцамі ў пікселях, а вунь па Храшчаціку шпацыруе Кася Камоцкая… а там, за столікам летняй кавярні, важнецкі такі Зміцер Бартосік з куфлем піва».

Час сыходзіў паражняком. Вось тады я прыняў рашэнне ўцякаць з «гуллівай» сталіцы ў правінцыю. І паколькі вельмі добра ведаў Чарнігаў раней і меў там з дзясятак даўніх знаёмых літаратараў, перабраўся ў гэты горад, найбліжэйшае да Беларусі месца. На шчасце, адразу напаткаў Вольгу, жонку прыяцеля-беларуса, якая займалася рыэлтарствам. Яна вельмі хутка дапамагла без дакументаў зняць прыстойнае жытло, амаль у цэнтры горада і нават з кансьержкамі. Мясцовыя праваабаронцы вырашылі на першы час праблему з грашамі, аказалі дапамогу з афармленнем папер на бежанства. Шмат дапамагаў Дом правоў чалавека ў Чарнігаве, вельмі добрая каманда. Я пэўны час жыў у іхнім доме ў ваколіцах слаўнага места Чарнігава і дагэтуль за тое ім удзячны. А калі выбіраўся ў Кіеў на беларускія акцыі ці імпрэзы — там прыходзіла на дапамогу амаль зямлячка, журналістка са Светлагорску. Хаця сама жыла з чатырма дочкамі і мужам, але ніводнага разу не адмовіла мне ў прытулку.

У Чарнігаве таксама атабарыўся і даўні мой знаёмец Андрэйка, з якім некалі перажылі «смаленскія прыгоды». Ягоны спакойны характар імпанаваў мне, ураўнаважваў маю халерычную натуру. Таму разам з Андрэйкам заўжды было камфортна, было з кім уволю нагаварыцца, павырашаць нейкія справы і паблукаць па сутарэннях Чарнігава.

Пакрысе я раблюся не такім ужо зляканым і разгубленым. Абжываюся сабе паволі ў Чарнігаве, набываю побытавую драбязу, вію ўтульнае гняздзечка, знаёмлюся з мясцовым людам, блукаю праспектамі і вулкамі, аглядаю званіцы храмаў і нетаропка смакую каньячок на легендарнай Болдзінай гары.

Першыя месяцы ўкраінскага жыцця я проста апіваўся кавай, кампенсаваў расейскі перыяд, калі гэты напой быў для мяне экзатычнаю раскошаю, бо грошыкаў лішніх не было.

Восенню пачаліся шматгадзінныя допыты-гутаркі ў міграцыйнай службе. Колькі ж розных папер я туды пераправіў — не злічыць. Усё сваё жыццё апісаў ім падрабязна і неаднойчы, да самых драбніц. Абы толькі хутчэй рухаўся працэс.

Я не такі ўжо і цікавы для цябе, мая смуглявая Шына. Распавядаю тут розныя дзівосы, а насамрэч жыццё да твайго нечаканага з'яўлення было больш празаічным і размераным. Ну, вось прыкладна так выглядалі мае спакойныя раніцы.

Падчас ранішняй прагулкі, а дакладна а 8:00, штодня заходзіў у адну і тую самую краму па цыгарэты (у іншых такога гатунку проста няма). Ветла павітаўшыся, прадавачка без лішніх слоў дастае патрэбны пачак, пытаецца абавязкова пра здароўе. Праз пяць хвілін падыходжу да кавяранькі. Спыняюся. Праз колькі хвілін адчыняецца аконца, і мне моўчкі падаюць маё ўлюбёнае эспрэса з малаком і адным цукрам. Нікому тлумачыць нічога не трэба. Пачынаецца асалода (хаця і шкодная) — кава з цыгарэтай.